«НІКОЛІ НЕ ГУБЛЯЙЦЕ МАРУ ДЗЯЦІНСТВА!»

Мы з Аленай ВАРАНОВІЧ пазнаёміліся выпадкова, на вуліцы. Адразу разгаварыліся і знайшлі агульную мову. Тады за кубкам кавы яна сказала мне важныя словы: «Ніколі не губляй мару дзяцінства». Алена заўсёды марыла быць мастачкай, але нарадзілася ў сям'і ўрачоў, таму ніхто не сумняваўся, што дачка працягне дынастыю. Яна і сапраўды скончыла медыцынскі ўніверсітэт, стала псіхіятрам. Але пра мару сваю ніколі не забывала. Некалькі гадоў таму яна зразумела, што вось ён, момант, калі трэба мяняць жыццё. Так здараецца, калі прыходзіць патрэбны час для перамен. А як мяняць? Страх, сумненні, як ва ўсіх людзей. Бо жыццё склалася: сям'я, дзеці, работа. Яна пачала вучыцца пісаць карціны па роліках на YouTube. Паступова Алена адточвала сваё майстэрства. Так здарылася першая выстаўка ў самай моднай галерэі ў Оршы. Карціны сталі купляць, з'явіліся першыя замовы. У Алены вялікі дом, дарослы сын і муж. Але самае галоўнае, яна не страціла за ўсім гэтым сябе і не здрадзіла сваёй дзіцячай мары.

Таццяна ТКАЧОВА, *г. Орша.*

Скарыстайцеся вашым смартфонам, каб адсканаваць QR-код і ўбачыць больш фота.